НАША БУДУЧЫНЯ

Цана асобнага нумару 300 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкаў да хаты 1200 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вертаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 400 мк., сярод тэксту 600 мк. і на апошняй страніцы 200 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 6. Серада, 14-га лютага 1923 г. Год II.

Верым у будучыну.

Мы надрукавалі прамову ў Сойме старшыні Беларускага Пасольскага Клюбу, Тарашкевіча, ня толькі затым, што гэта—першае парлямэнтарнае выступленьне беларусаў на грунце польскае дзяржаўнасьці: яна яшчэ тым цікава для кожнага сапраўднага сына Беларусі, для кожнага, хто верыць у сьвятлейшую будучыну аб'яднанае і незалежнае Бацькаўшчыны, бо ў ёй заяўлена і падчыркнута перад усім сьветам, што *Беларускі Народ ні пры якіх варунках не зракаецца і не зрачэцца ідэі незалежнасьці Беларусі.*

Многа было гутарак, быццам беларуская незалежніцкая ідэя перажывае крызіс. Так здавалася тым, хто углядаўся на беларускае грамадзянства і яго правадыроў аднабока, з нейкай наперад узятай думкай. Гэтага ня было і хай ня будзе.

Можна вясьці спорку аб тым, як і калі беларусы павінны прыступаць да зьдзейсьненьня гэтае ідэі. Мы бачым два дыамэтральна процілежныя кірункі: там, на Усходзе. Беларусь будуецца на камуністычных асновах—праз дыктатуру пралетарыяту; тут, на Захадзе, выдзеляюцца настроі дэмакратычныя. Такое раздваеньне ў *тактыцы* здабываньня незалежнасьці грунтуецца, з аднаго боку, на розьніцы ў вонкавых абставінах там і тут, з другога-ж—на тым, што Беларускі Народ, падзелены на часткі кітайскім мурам, які збудаваны ў Рызе, у справах палітычнае тактыкі ня можа стварыць аднолькавага пагляду для Усходу і Захаду. Ня можа, бо ня мае лучнасьці, бо родныя браты, ня маючы магчымасьці нават дагледзіць адны адных з-за гэтага муру, ня могуць вытварыць сабе і аднае палітычнае лініі ў пытаньні аб рэалізацыі таго супольнага ўсім беларусам ідэалу, які сьвяты ў роўнай меры і на Усходзе, і на Захадзе.

Мы крытычна углядаемся на тактыку эвалюцыянераў, але павінны зусім шчыра сказаць, што ўсялякая праца, якая дае нам магчымасьць узмацаваць нам нашу нацыянальную моц, сілу нашага духа і культуры, ёсьць праца добрая, ёсць служэньне справе незалежнасьці, робючы гэтую ідэю самай пільнай, самай неадкладняй духовай патрэбай.

І мы з глыбокай верай глядзім у будучыну нашага народу, бо бачым яшчэ лішні доказ, што *няма між беларусамі разнабою у пытаньні аб агульна-нацыянальным ідэале*, — бачым, што Беларусь *будуецца і збудуецца!*

Палітычныя падзеі.

Францыя. Арыштаваны і пасаджаны ў вастрог дэпутат камуніст Кашэн. Кашэн прыймаў удзел у нарадзе прадстаўнікоў нямецкіх камуністаў у справе акупацыі французамі Рурскага басэйну.

Французкая правінцыя Брэтань дамагаецца незалежнасьці.

Англія. У Вашынктоне надпісаны дагавор аб англо-амэрыканскіх даўгох на суму 4.004.126.085 даляраў.

Нямечына. Адбыўся абмен ратыфікацыйнымі дакумэнтамі дагавору у Рапало паміж Расеяй і Нямеччынай.

У Кёнігсбергу адбыліся паважныя дэманстрацыі проціў французаў, англічан і палякаў.

Рэпрэсіі французаў у Рурскім басэйні трываюць далей. Заняты новыя абшары. Можна спадзявацца ў недалёкай будучыне акупацыі ўсей паўднёвай Нямеччыны.

Літва. Рада паслоў выслала да Літоўскага ўраду ультыматум, каб у працягу трох дзён была ачышчана тэрыторыя Клайпэды ад паўстанцаў. Саюзьнікі вымагаюць выдачы Клайпэдзкімі паўстанцамі аружжа; паўстанцы адмовіліся і заявілі, што будуць да канца змагацца за незалежнасьць бацькаўшчыны

Ліга Нацый. У Парыжы адбылася чарговая сэсыя Лігі Нацый, на якой, паміж іншымі, выраишана справа аб падзеле нэйтральнай зоны паміж Літвой і Польшчаю. Участак жал. дар. Вільня-Горадной прысуджаны Польшчы. Польскі прадстаўнік праф. Аскэназы згадзіўся на гэты падзел, прадстаўнік-жа Літвы — катэгарычна запратэставаў і заявіў, што Літва на падзел ніколі ня згодзіцца.

Польшча. Міністар Унутраных спраў зьвярнуўся да ваеводаў у „Кангрэсоўцы“ каб прадставілі кандыдатаў на пасады старостаў на Крэсах. (Гэта называецца аздараўленьне адносін на Kresach).

У ўрадовых колах абгаварываецца магчымасьць стварэньня спэцыяльнага дэпартаманту для Крэсаў, які будзе бэзпасрэдна падпарадкаваны Старшыні Міністраў.

Камуністычны пасол Круліковскі зволнены з вастрогу і прыехаў да Варшавы.

У Варшаускім Сойме Міністар Заграмічных Спраў п. Скржыньскі ў сваей прамове заявіў, што Польшча стаіць на грунце выкананьня міжнародных мірных трактатаў.

Міністар фінансаў Грабскі, абрысаваўшы цяжкае фінансавае становішча Польшы падкрэсьліў патрэбу павялічэньня падаткаў.

Прыняты большасьцю 194 галасоў проціў 143 (эндэкаў і жыдоў) часовы бюджэт на першую чэцьвярць 1923 г. Сума расходаў прадбачана на 1200 мільярдаў марак польскіх.

Украінскі пасольскі клюб падау у Сойм сьпешныя прапазыцыі аб увядзеньні украінскай мовы ў школах, у справе арыштаў і у справе хаотычнай гаспадаркі на Украінскіх абшарах.

„Kurjer Lwowski“ паведамляе, што Урад Петрушкевіча выслау ноту да дзяржау Антанты, ў якой дамагаецца, каб Антанта забараніла Польшчы здаваць у арэнду чужынцам газавыя крыніцы, бо Польшча ня мае права да газы у Галічыне.

У Беластоку закончылася забастоўка работнікау якая цягнулася 25 дзён. Работнікі дабіліся подвышшеньня платы на 100%.

Бухарын аб сучасным становішчы.

Бухарын у лісьце да [illegible]аднаго савецкага агента ў Францыі выказаў такія думкі:

Соцыяльная рэвалюцыя ў Эйропе і ў цэлым сьвеце можа працягнуцца шмат гадоў. У працягу гэтага працэсу пралетарскія дзяржавы могуць быць прымушаны ўвайсьці ў часовае паразуменьне з прыгнечанымі і слабымі буржуазнымі дзяржавамі проціў мацнейшых і прыгнетаючых, як напрыклад, цянерашняе паразуменьне Саветаў з Турцыяй проціў заходняга імпэрыялізму. Калі-б, напрыклад, у Нямеччыне распачалася рэвалюцыя, а Польшча накінулася-б на Нямеччыну з усходу, то саюз Савецкіх Рэспублік змушаны быў-бы выступіць проціў Польшчы. І ў гэткім выпадку рэвалюцыйныя работнікі ўсяго сьвету павінны былі-б падтрымаць як рэвалюцыю ў Нямеччыне, так і вайну проціў Польшчы. У тым выпадку, калі-б Літва захацела выкарыстаць сытуацыю для выступленьня проціў Польшчы, дык адпаведная ваенна-палітычная умова з Літвою была-б зусім магчыма.

Літвінаў заявіў, што саюз Сав. Рэсп. не прызнае Усходнай Галіччыны часьцінай Польшчы, а так-сама не прызнае і мандату на 25 гадоў, якім надзяліла Польшчу Рада паслоў.

Пратэст расейскіх эс-эраў.

Прыгавораныя к сьмерці расейскія эсэры, якія трымаюцца ў вастрозе ў надта цяжкіх варунках зьвярнуліся з пратўстам да ВЦІК-у.

Саветы проціў акупацыі Руры.

Цантральны Камітэт горнарабочых ахвяраваў 100 мільярдаў рублей, а Цантр. Савет Профсаюзаў 100.000 залатых рублёў на дапамогу рабочым Рура. Украінскі Чырвоны Крыж тэлеграфаваў аб сваей гатоўнасьці памагчы работнікам. Па ўсей Расеі выносяцца пратэсты і адбываюцца дэманстрацыі проціў акупацыі Рурскага басэйну.

❋❋❋❋

З газэт.

Наша праўда.

Віленская газ. „*Słowo*“ у № 29 у сваей перадавіцы ліець сьлёзы над тым, што уплыў шляхты і ксяндзоў на „*Kresach*“ нанырнуў у вечнасьць.

Зьнікаюць даўнейшыя пляцоўкі польскасьці на „Kresach“ і што рэдкі тут ёсьць польскі элемэнт, які мог-бы зажыць, заменяюць яго асадпікі без інвэнтара, на манер Аракчэеўскіх калёніяў і наезжыя урадоўцы, якія жывуць адгарадзіўшыся ад рэшты грамадзянства неякім кітайскім мурам, значыць, элемэнты, якіх першая бура павінна зьмясьці

З гэтага бачым, што урэшце жыцьцё змусіла прызнаць нашу праўду хоць частку польскага грамадзянства. Так, польскасьць на „Крэсах“ трымалася толькі ў маёнтках, касьцёлах і ў прыезднага элемэнту, цяпер голас мае адвечны тутэйшы жыхар, пазнаўшы сабе цану—беларус.

❋❋❋❋

Весткі з Сойму.

⚭ 10-га лютага ў Сойме перад першым чытаньне урадовай прапазыцыі, аб удзяленьні за парукаю Ураду крэдыту 120 мільёнаў марак гміне м. Львова, выступіў з прамоваю пасол-украінец грамадзянін Луцкевіч, які сказаў, што ён проціў асыгнаваньня дзяржаўных крэдытаў тым тэрыторыям, якія Лігай Народаў яшчэ аканчальна не прызнаны належачымі да Польскай дзяржавы, як, напрыклад, Усходняя Галіччына. Такая, здаецца, зусім слушная і цьвярозая заява, абапёртая на трактатах падпісаных самай Польшчай, выклікала ў Сойме цэлую буру. З лаваў польскай правіцы і цэнтру разьлягліся бурныя пратэсты і крыкі: „праваказтар“, „бальшавіцкі шпік“, і г.д. Маршалак Ратай, які наагул да нацыянальных меншасьцяў заўсёды вельмі несправядлівы, спыніў гр. Луцкевіча і пасьля зусім адабраў у яго слова.

Цікава, ці удасца тым, хто крыкам заглушае голас праўды ў сваей хаце, абдурыць такім спосабам і цэлы сьвет?! Усе гэтыя паны неразумнымі пастўпкамі як-бы хочуць сказаць меншасьцям: дармо дамагаецеся і спадзеяцёся на нашу Польшчу!

⚭ Забойства мітрапаліта Юрыя галавы праваслаўнай царквы ў Польшчы, выклікала з боку Беларускага і Украінскага Пасольскіх клюбаў выступленьне у Сойме аб найскарэйшым склікаеньні Сабора з прадстаўнікоў ад духавенства і міран праваслаўнай царквы у Польшчы.

⚭ Кс. А. Станкевіч 7-га лютага ў справе бюджэтнага провізорыюма сказаў у Сойме вялікую прамову, ў якой дамагаўся ўнясеньня ў бюджэт патрэбаў беларускай школы, адбудовы зруйнаваных гаспадарак і сацыяльнай апекі.

⚭ „*Kurjer Polski*“ паведамляе, што п. Сярэбранікаў, які кандыдаваў да Сойму і Сэнату, пастанавіў прыняць мандат да Сойму. Дзеля гэтага вакантны мандат з 16-кі да Сэнату прыме А. Уласаў, вядомы беларускі дзеяч, б. рэдактар „Нашае Ніва“.

❋❋❋❋

Аб Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце.

Газэта „Савецкая Беларусь“ пасьвячае ўвесь № 224 Менскаму Унівэрсытэту, на першыя яго ўгодкі. У сваей перадавіцы газэта кажа, што Беларускі Унівэрсытэт „адчынены быў дзеля таго каб рабочы Беларусі, каб бедак селянін меў магчымасьць увайсьці ў сьвятое сьвятых навукі, каб маглі загартаваць там сваю волю, свае імкненьне, сваю рэвалюцыйную сілу.“

„..Пабудованы ў цэнтры маладой рабоча-сялянскай Беларусі, пабудованы з мэтай спрыяць росквіту разбуранага вайнамі і контр-рэвалюцыяй краю.“

У. Ігнатоўскі ў сваім артыкуле „Гадавіна нашага унівэрсытэту“ піша:

„На маладым дрэве, ўжо выраслі тры галіны і абраслі пабегамі. Гэта факультэты нашага унівэрсытэту: пэдагогічны, грамадзкіх навук і мэдыцынскі з іхнымі аддзеламі і сэкцыямі. Дзьве з паловаю тысячы нашай моладзі пра-

цуе на ўсіх факультэтах універсытэту. Больш як 100 навуковых работнікаў рукаводзяць гэтаю працаю."

Выказываючы пахвальное слова гэтым работнікам за шчырую працу У. Ігнатоўскі заканычвае: „Няхай жыве наша будучына, наш рабоча-сялянскі універсытэт!"

А. Смоліч у вялікім артыкуле „Вялікае здабыцьце" выказывае радасныя думкі.

„Кожны раз, калі я прахажу міма ўнівэрсытэцкіх муроў і чытаю надпіс: „Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт" — гэтыя тры словы здаюцца мне поўнымі ўсё новага і глыбейшага зьместу. Мы, народ, які яшчэ ўчора стаяў на мяжы быцьця і нябыцьця, і сёньня змушаны крывавымі высілкамі разьбіваць сьцяну рэакцыі на заходзе, каб здабыць сабе права на людзкае істнаваньне, каб адваяваць пачатковую беларускую школу, мы тут ужо цэлы год як маем найвялікшае культурнае здабыцьцё народаў—вышэйшую школу, кузьню нашае роднае культуры, лепшае будучыны для гаротных масаў Беларусі!"

«Савецкая Беларусь, ствараючы свой унівэрсытэт, выйграла вялікую перамогу над усімі сваімі ворагамі, над сваімі буржуазнымі суседзямі. У яе руках апынулася наймацнейшае аружжа з нязломнае, гартаванае сталі. Гэтае аружжа—беларуская культура".

З. Жылуновіч разглядаючы сумную мінуўшчыны Беларусі кажа:

„Доўгія гады царскае ўлады Беларусь мусіла заставацца бяз вышэйшай навуковай установы і застаючыся бяз яе, мусіла пасылаць сваіх дзяцей рэдкімі ядынкамі або ў Маскву, або ў Варшаву. Цэлая-ж краіна амаль не з пятнаццацю мільёнамі жыхароў, ня ўгоджвалася перад моцнымі сьвету мець сваю alma mater.

„Беларускі селянін, калі хацеў сваім дзеткам расплюшчыць вочы няведаньня, — ён прымушаўся крывіць іх душы і абманваць іх вочы. У сваіх дзецях вышаўшых з тагочаснае навукі, беларускі селянін знаходзіў калек, яны ня любілі сябе, як дзяцей простага народу, ня любілі мовы, на якой гадаваліся, ня любілі назваць сваім імем краіну, якая часта іх карміла".

„Беларусь дачакала ўнівэрсытэту. Трэба ж выйсьці з няволі цямноты, трэба ж адрадзіць край і працоўны народ, каб сьвядома зраўняцца з іншымі другімі краямі".

Рэктар Бел. Дзяр. Унівэрсытэту В. Пічэта, абрысоваўшы цяжкія абставіны ў якіхпрыходзілася працаваць у працягу году, даказвае, што унівэрсытэт усёткі заваяваў сабе поўнае грамадзкае становішча, ніколі не замыкаючыся ў вузкую сфэру акадэмічнай дзейнасьці.

„Унівэрсытэт стараўся выйсьці за межы сталіцы Беларусі праз уладжаньне лекцый у Барысаве, Бабруйску і Слуцку. У будучыне гэтая справа яшчэ болей разьвінецца. Асобныя прафэсары і лектары прыймалі ўдзел у наладжаньні паўторных пэдагагічных курсаў як у сталіцы Беларусі так і ў правінцыі. Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт мае на мэце арганізаваць systematычныя лекцыі ў павятовых местах Беларусі, паўторныя курсы для школьных працаўнікоў, каапэратыўныя курсы. Унівэрсытэт павінен стаць цэнтрам кожнай навуковае грамадзянскай справы на Беларусі І ён гэтым стане, калі будзе мець адпаведныя матэр'яльныя сродкі."

„Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт пазірае на сябе, як на цэнтр, вакол якога павінны зьбірацца цяперашнія і будучыя працаўнікі па пазнаньню мясцовай культуры. Унівэрсытэт лічыць, што ў недалёкай будучыне маладыя беларускія сілы ўліюцца ў яго і зоймуць у ім адпаведныя вучоныя катэдры. У цяперашнім часе Унівэрсытэт аддае мясцовай культуры першараднае значэньне, уводзячы дзеля гэтага адпаведныя курсы, альбо ствараючы цэльныя аддзяленьні з асобным цыклам навуковых дысцыплін, сярод якіх беларусазнаўства займае першае месца. Унівэрсытэт спадзяецца, што быць можа у недалёкай будучыне ён верне на родную тэрыторыю ўсе вучоныя беларускія сілы, якія цяпер працуюць за межамі Беларусі".

„Унівэрсытэт увайшоў у сучаснае палітычнае і грамадзянскае жыцьцё Беларусі і пры падтрымальні рабочых і сялянскіх масаў ён зараз акрэпне і асьвятліць сваім сьвятлом ваколічную цемнату".

І ўрэшце такімі словамі высока натхненнымі і поўных здаровай думкі заканчывае свай артыкул рэктар унівэрсутэту, муж, які нясе сьветач маладой культуры:

„Няхай квітнее малады Дзяржаўны Унівэрсытэт, няхай усе працуючыя ўвойдуць у яго дзеля навукі, няхай ён дасьць веду і тэхніку ўсім, хто хоча тварыць новае жыцьцё. У саюзе з працуючымі сіла і значэньне нашага Унівэрсытэту. Няхай жыве саюз навукі і працы, бо толькі за імі будучына, толькі ў іх б'ецца маладое радаснае жыцьцё!".

Прамова пл. Б. Тарашкевіча.

(гл. № 5 Н. Б.)

Нарэшце прышла рэвалюцыя 1905 году ў Расеі, прышла наастатак рэвалюцыя 1917 г., і Беларускі народ пад уплывам змаганьняў народаў, сусветнай вайны і адгалоскаў польскай барацьбы за незалежнасьць, збудзіўся і устаў да нацыянальнага жыцьця, ўстаў хоць з кайданамі на руках, хоць на яго целе сочацца яшчэ раны ад розных граніц і розных кардонаў.

На Усебеларускім Зьездзе 1917 г. (п. Солтык: у Менску?) так у Менску, пане пасол, прадстаўнікі Беларускага народу абвесьцілі тагды перад цэлай Расеяй і перад цэлым сьветам, што хочуць жыць жыцьцём вольным, жыцьцём уласным, нацыянальным. Абвявыцілі і незалежнасьць Беларусі. (Хай жыве!" Вокляскі).

А калі пасьля пагрому немцаў п устала незалежная Польшча, дык з боку Польшчы мы пачулі лёзунгі так папулярныя і так знаныя, так выслаўляныя ў польскай гісторыі: „Вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі". Бадай нідзе гэтыя лёзунгі ня былі так проста, так шчыра разумелыя, як у нас на Беларусі. Верылі ў гэтыя лёзунгі, думалі, што запраўды Польская Дзяржава, польскі народ, які так доўга цярпеў у няволі, зразумее другі народ і дасьць яму дапамогу. І вось пасьля аказалася, што паміж жыцьцём і лёзунгамі была надта вялікая супярэчнасьць. Адно казала адозва тагачаснага Начальніка Дзяржавы Язэпа Пілсудскага, выданая ў Вільні, ў якой даваў абяцанкі пастанаўляць аб сваім лёсе, самаазначэньні, а другое нясьлі польскія войскі. Польскія войскі нясьлі за сабою... (галасы на беларускіх лавах: „ярмо!") не нацыянальнае вызваленьне, але вызваленьне для лятыфундзій вялікіх абшарнікаў, (вокляскі на беларускіх лавах (П. Солтык: „Гэта ўжо няпраўда. Гэта пан перасаліў". Голас на правіцы: „Стары кавалак, абвешчаны ў бальшавіцкай Расеі").

Быў створаны „Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich", урад, у якім ня было ні аднаго ўрадоўца беларуса, ўрад выключна польскі, і ня толькі польскі, але я сказаў-бы, панскі. І гэтыя віцэкаралі Беларускай Індыі, паны Асмалоўскія і Івашкевічы, якія бралі ў Менску ўдзел у абвяшчэньні незалежнасьці Беларусі, пачалі гававыць, że to jest Białoruska (іранічны сьмех на беларускіх лавах). Дык вось калі Беларусь змагалася з Расеяй, тады была Беларусь, але калі Беларусь дасталася пад уладу Польшчы, дык ужо ня было Беларусі, толькі Białopolska. Тады адкрыліся цынічныя пляны ніштажэньня беларускасьці і каляніізацыі тыясамыя пляны,-якімі п. Карфанты з так вялікім талантам змагаўся ў Пазнані.

Польскія войскі пашлі далей на ўсход, пашлі, каб абхапіць большасьць беларускіх абшараў, стварыць, як гавалася, незалежную Украіну. Але як можна было гэта рабіць, калі, маючы Беларусь, Польшча не патрафіла даць вольнасьці гэтаму народу, а наадварот зусім выразна паказала свае захватныя дэнацыяналізуючыя мэты. Паход польскіх войскаў наперад не даняў мэты ня дзеля таго, што Украіна не хацела гэтай вольнасьці, але што народ Украінскі, добра разумеў, што войскі польскія нясуць з сабою (п Солтык: „Вы самі не хацелі, хай пан прыпомніць гэты зьезд у Менску). Нарэшце, якія былі адносіны польскага войска да Беларусаў, можа паказаць прыклад, калі гэтыя войскі адступалі з Беларусі. Карацельная экспэдыцыя за экспэдыцыяй (голас: „Дзе"?) Там, дзе пан ня ведае. (голас: „А расейскае войска, што рабіла?"). Зусім ня хвалю і расейскае войска. Калі Беларуская дэлегацыя пашла да генарала Шэптыцкага аб адмене гэтага тэрору, ён сказаў, што камень на камені не застанецца, ўсю Беларусь спаліць, каб толькі польскі жаўнер мог выйсьці з гонарам з Беларусі. (п Солтык: „Відаць былі іншыя прычыны. Быў загавор у Менску") Ніякага загавору ня было (Голас: з украінскіх лаваў: „Фантазія!" П. Солтык: „Не фантазія, на жаль гэта факты!")

Урэшце прышоў Рыскі мір і тут з поўным цынізмам паказана перад цэлым сьветам, як Польшчы залежала на Беларусі. Падзелены жывы народ на часткі, ўтвораны розныя калідоры, ў якіх ёсець такі скразьняк, што ня аднаму можа скруціць голаву. І вось адзін з цяперашніх нашых левіцовых сябраў, які тады займаў высокае становішча, сказаў: „Мы мелі сілу, дык падзялілі вас, як вы будзеце мець сілу, то падзеліце нас". (Галасы на левіцы: „Хто такі?") Дашыньскі. (Голас: „Як завецца?") Дашыньскі (Голас: „Ганьба!" п. Дашыньскі: „Я сказаў гэта?") Так. (п. Дашыньскі: „Цяпер проста скажу пану, што пан кажа абсалютную няпраўду; ўважаю гэта за нячуваную непашану да трыбуны, каб гаварыць хвальшы)

Маршалак: Дам пану пазьней слова для папраўкі, цяпер-жа прашу не перашкаджаць прамоўцу.

БЕЛАРУСКАЯ КАЗКА.

Жыла сабе бедная ўдава. І былі ў яе тры сыны. Адзін быў валакіта, марнатраўца, а працы баяўся, як чорт крыжа. Не прапускаў ён ні аднаго кірмаша, на якіх п'яны любіў пабуяніць, напрыкудзіць мястачковым і кірмашуючым. Шукаючы лёгкага хлеба і раскусных асалод у жыцьці пачаў ён валэндацца па чужых старонках. аддаючы свае ўслугі шальмоўству, роскашы і душагубцам. Але-ж ведама, што хлеб найміта не здаровы і не салодкі і сын-валакіта кідаўся з мейсца на мейсца, прызываючы на помач злыя, шкодныя сілы, а дрыгва жыцьця што раз глыбей загортывала яго ў свае абоймы. Не паланела сэрца валакіты—найміта на заклік кахаючай маці, вярнуцца пад родную страху, ня чурацца свайго роду і простых звычаяў. Ані музыка, ні песьня не акрылялі яго струхлеўшай душы. Прыкра было з ім маўчаць, а гутарка злой сваркай канчалася. І людзі з далёку абміналі яго, як вужаку ядавітую, як залом ведзьмарскі.

Болем балела сэрца маці за блудным сынам. Плакалі яе вочы ўзіраючыся ў сінюю даль, а крыж на растайных дарогах часта-густа чуў яе сьлёзны стогн. А колькі намалілася і наваражылася, і ахвяры клала, і пакутавала! І мілей—бы ёй сьмерць была за жыцьцё, каб ня другі сын — рабачай ад ральлі, яе хлебадаўца і апора старасьці. Спакойны, рахманы, працавіты як мурашка, шанаваў хвалу гаспадара, а значыць і гаспарка яму спрыяла, ручыла. Карыстаўся пашанай у вёсцы, бо быў добры сусед—нікому, як кажуць, вады не замуціў ды і на Бога не забываўся. Кожнага жабрака надзеліць, гасьця—прывітае чым хата багата, а хай заазьвініць у якім вуху, дык перажагнаецца і тройчы плюнець. І нечысьць да яго не магла прыкараскацца. Ніколі не пахаеў малодшага свайго брата Янука, празванага статэчнымі гаспадарамі дурным. Цэлымі днямі пралежываў Янук на печы, вытылінківаючы на жалейцы: „Былі ў бацькі тры сыны". Дармо ён еў хлеб, бо каб памагчы што ў гаспадарцы—ніколі. Толькі-ж дурната яго была незразумелая, бо часам як аб чым скажа, дык як зьвяжа, адразу усё ясна стане і уся вёска падхопіць і доўга неракідаюцца гэтым сказам. Слыў Янук і добрымі вачмі і лёгкай рукой. Каб вельмі ручыла новароджанае жывёліна, дык трэба было на яго Януку першаму глянуць, каб ураджайная была ніва, дык Янук павінен быў рассеяць хоць адну жменю. Летам Янук рэдка дома сядзеў: любіў ён бадзяцца па лясох і слухаць шум-гоман лясны, пяяньне птушак. Станець у гушчары проставалосы, нярухомы, галаву крыху на бок зьвернець, вочы быццам нічога ня бачаць, як у непрытомнага і слухаець цэлымі гадзінамі. І птушкі яго не баяліся—садзіліся на калматую галаву ды весяла чырыкалі кругом. Тады ніяк ня скажыш вар'ят ён ці сьвяты.

Наслухаўшыся сакавітай музыкі прыроды прабаваў ён зрабіць новую жалейку, каб пераліць уражайна-дасьпелую душу ў чулагучнае граньне. Толькі-ж жалейкі такой яму не удавалася зрабіць і песьня „Былі ў бацькі тры сыны" ізноў каціласяпявучымі хвалямі з печы.

Занемагла раз удава і напоўніла хату стогнам — хворасьць на доўгі час кінула яе на ложка. Бяда разселася на покуце, журба стала пры парозе. Не адзін маладзік мінуў, перапробавалі розных зёлак, прыпарак, загавораў, а папраўы ня было.

Цэлы век свой удава ня знала радасьці ў жыцьці. Гора вадзіла яе па сьнежках жыцьцёвых, цярпеньне сачыла па сьлядох, Ня лёгка была ўтрымацца пад цяжарам надмернай працы. І ўрэшце знедужэла і звалілася.

Глыбокі сум агарнуў яе добрых сыноў. Нячаканая бяда зьбіла з панталыку хлебароба—работа стала з рук валівацца, ня ручыла і ў гаспадарцы, бо апекунчыя думы гаспадара зьмяніліся у тугу-сум кахаючага сына. Спахмурнеў і Янук. Заціхлі яго песьні і граньне. Кідаўся па хаце з кута ў кут і думаў ён адну думу: як ратаваць дарагую матулю. А як ратаваць? Маліцца Янук ня ўмеў, новыя песьні не складаліся, лекаў ніякіх ня знаў, меў толькі гарачае, кахаючае сэрца і чулую душу. Дык нічога дзіўнага, што Янук браў гарачыя вугольля ў жменю і трымаў, аж пакуль тое ня гасла і шаптаў: каб толькі паздаравела. Нічога дзіўнага, што ён цэлымі начамі прыслужываў хворай, бяз слоў разумеў яе жаданьні, сваім узглядам прытупляў яе вострую боль. Толькі як певень запяець, а зарніца адаб'ецца ў яго бязсонных вачах, тада ён клаўся на печ і засыпаў трывожным сном.

Аднаго разу, кал зьмерканьне напоўніла хату, негдзе на загуменьні завыў сабака, а ў сенцах сама па сабе звалілася каса са сьцяны, Янук прабудзіўся, з трывожным непакоем стаў туліць да сябе хворую, як бы баронючы яе ад грознай, нявідзімай сілы. Усьцішала яго маці кахаючай гутаркай, гладзіла ласкавай рукой, але Янук быў поўны трывогі. Ен раскызаў, што яму ў час сна пачуўся выразна голас, які казаў, што маці датуль ня выздаравея, пакуль яны сыны не раздабудуць сьлёз радасных, сьлёз ад шчасьця.

Сын хлебароб, пачуўшы гэта, заайкаў ківаючы галавой, махнуў зьнявера рукой, бо дзе-ж відана, каб у нашай старонцы - ох, спавітай злой ночай мог хто плакаць ад шчасьця.

Зато Янук прысягнуў перад хворай, што хоць пад зямлёй, але дабудзе, — ня верніцца бяз гэтых надзвычайных лекаў, што ён сярод зла і гора здалее найсьці нешта сьветлае, радаснае, пазнаўшы якое людзі заплачуць ад уміленьня, што калі яму сьмерць перашкодзе дайсьці да мэты, дык ён шчасьліў будзе ўжо тым, што жадаў, дабіваўся, што даказаў сваё бязмернае каханьне да маці.

. . . . . .

Была цёмная ноч, а віхор злосна стукаўся ў трухлявыя сьцены ўбогай хаціны ўдавы, трывожыў скрыпучыя вербы і скаголіў па шчэлках і ў коміне. Куры на куроснах будзіліся ад трывожных церасьцярог пеўня. Сабака заціснуўшыся ў кут будкі ветрыў носам і жаласна скомліў. Каля восеці галёкала сава. Немарасіць і страх апанавалі ўсё жывое, толькі блуднаму сыну ўдавы было хоць-бы што. Зужыткаваўшы здароўе і ўсё зароблена на распусту, вяртаўся ён да хаты прыслуховываючыся да гідкіх нагавораў рознай нечысьці, якой у гэтую страшную ноч было ўсюды поўным—паўнюсенка. Увайшоўшы ў хату ён ударыўся галавой у касяк, бо адвык ад сваіх парогаў і брыдкай лаянкай перабіў малітву хлебаробу, які збіраўся ужо ночку начаваць.

— Ціха, браце, матулю разбудзіш.

— А што яшчэ ня спрухнела — жывучая як руды кот.

І далей гэткай прыкрай гаворкай найміт пачаў дамагацца грошы, сваей часьці ад гаспадаркі, казаў, што браты яго крыўдзяць, што трэба маці прагнаць, бо яна дармаедка і лішніца ў хаце.

П. Дашыньскі: Калі ўсё ёсьць такой-жа праўдай, як тое, што пан цяпер сказаў, дык віншую пану, як абаронцу беларускага народу.

П. Тарашкевіч: Адкажу Вам з доказамі ў руках! А далей, урадовы праэкт калянізацыі. Ужо з вобласьці далейшых плянаў і гутарак Урад пераходзіць да рэалізацыі. Пан міністар Скульскі сказаў, што за 50 гадоў не знойдзеце нідзе ніводнага беларуса нават са сьвечкай. (Крыкі).

Далей, панове, пераходжу да фактаў і рэчаў, з якімі ніхто ня будзе спрачацца. Створана сыстэма ўрадаваньня, якая мае на мэці поўнае зьнішчэньне фізычнага тыпу беларуса да палянізацыі. Перадусім праэкт калянізацыі і вайсковага асадніцтва. Увесь Сойм і правіца, і левіца галасавалі за гэты закон аб, так званых, пакінутых землях. Гэты закон пастанаўляе, што тыя земляўласьнікі, якія не вярнуліся да 1 красавіка 1921 г., прымусова пазбаўляюцца сваіх земляў на карысьць Дзяржавы. Мірны трактат быў падпісаны 18 сакавіка і ратыфікаваны, колькі прыпамінаю, ў траўні, дык як-жа маглі гэтыя людзі вярнуцца да 1-га красавіка? Панове, гэтаж ёсьць гвалт, гвалт нячуваны, гэта такі гвалт, які за прыклад браў сабе гакату, які нават гакату апярэдзіў, бо там за зямлю плацілі, а тут уласьнікам гэтай зямлі нават ня плацяць. (Голас: „Гэта таксама скіравана процім палякаў). А чаму-ж гэты закон разцягнуты толькі на паветы так званых „Kresów“, на 22 крэсовыя паветы? (п. Солтык: „Гэта стасуецца ня толькі да вас, але і да палякаў“). Цярпіць ад гэтага насяленьне выключна беларускае і украінскае праваслаўнае. А далей вайсковая калянізацыя, з якой, думаю, нават і паны з правіцы не задаволены, дзеля таго, што перадусім зямлю атрымалі галоўным чынам толькі афіцэры, нават тыя, якія маюць уласныя маёнткі. Мог-бы прывесьці цэлы шэраг прыкладаў, што, ўрэшце, мы зрабілі ў сваім запытаньні ў гэтай Высокай Палаце.

Прынята аграрная рэформа, але дзе гэтая рэформа праведзена на карысьць беларускага селяніна, які ўканцы-канцоў мае найбольшае права да гэтай зямлі, на якой ён працаваў, на якой працавалі яго бацькі, на якой працавалі яго прадзеды. (Голас: „Ніхто ім гэтага не адбірае). Другім разам на гэта адкажу.

Далей, што-ж робіцца з усей гаспадаркай краю? Гаспадарка такая, што край нішчыцца да шчэнту. Найвялікшае багацьце нашага краю—лес—рабункова ніштожыцца і ніштожыцца ўласьнікамі ў хаўрусе з тымі, каторых так ня любіце: пан і жыд-спэкулянт працуюць там у хэўры і нішчаць наш дабрабыт і нашае найбольшае багацьце.

Цяпер як стаіць справа з тымі падставамі, якія урачыста абвешчаны ў Канстытуцыі, якія гварантуюць кожнаму народу свабоду, разьвіцьця культуры, ў якім палажэньні знаходзіцца справа школьная. І вось-жа перадусім школы зачыняюць. Зачынэныя дзьве вучыцельскія сэмінарыі, а замест іх ніводнай не адчынена. (Голас: „Дзе“?) У Барунах і Сьвіслачы, зачынена гімназія ў Будславе зачынена каля 100 пачатковых школ. (Голасы: „Расейскіх“). Не расейскіх. (п. Солтык: „Калі я быў у Вільні на адкрыцьці ўнівэрсытэту, то бачыў, што вы сабралі людзей, якія ня ўмелі гаварыць пабеларуску“). Аб гэтым пагаварым у іншым мейсцу. (Голас: „Няма Беларускага народу“). Пан ня хоча бачыць, хай пан надзене акуляры.

Маем далей масовыя прасьледаваньня пад лёзунгам — бальшавік. Усюды бальшавік. А якія гэта былі прасьледаваньні, якую яны мелі пад сабою падставу, можа паказаць вам прыклад 33 грамадзян Польскай Рэспублікі, высланых за граніцу бяз суда і сьледства 5-га лютаго 1922 г. Гэта ёсьць так званая Віленская справа, аб якой, бадай, ведае Міністар Заграмічных Спраў. З гэтага поваду хачу сказаць колькі слоў і аб справе Вільчі наагул,

Вынікам апэрэтачнага бунту ген. Жэлігоўскага ўтварылася Тымчасовая Урадуючая Камісія. Можна было думаць, што Польшча захоча стварыць Урад злажаны з розных нацыянальнасьцей (Голас: „Ого! і жыдоўскай“), так, бо ў Вільні жывуць і жыды, і падгатовяць край да самаазначэньня. Тымчасам аказалася, што гэтае урадаваньне было аднабокім процім грамадзян няпольскай нацыянальнасьці. Быў скліканы Сойм. Сойм ухваліў далучэньне да Польскай Рэспублікі (Голас: „Да якога беларусы не маглі правясьці ні аднаго пасла“), бо мы да гэтага Сойму ня пашлі. Але мы маем той пагляд, што гэтая пастанова Сойма вялікага аўтарытэту мець ня можа. Выбачайце, панове, вось-жа мы, калі хацелі правясьці паслоў да Сойму Польскай Рэспублікі, то і правялі, а калі да Віленскага Сойму не хацелі, то і не правялі. (Голас: «Бо грошай ня было!“) Грошай ня было вы давалі? Вы давалі нам, але мы ня ўзялі. Наступіла помста ўладаў, за тое, што мы не пашлі тагды да выбараў, як і цяпер спаткае нас помста за тое, што мы пашлі і прайшлі, У Вільні чуў рэч нячуваную ў судзе. Судзілі аднаго рэдактара літоўскай газэты. Слухаючы прамову пракуратара, чуў такія словы: Я дамагаюся помсты закону. Гэта можна спраўдзіць у пратаколе. (п. Солтык: «Хто гэта сказаў?»). Пракуратар акружнага Суду ў Вільні. Дык вось, панове, помста. ўрадаваньне пад знакам помсты! (Голас: „Помста права!“) Чую тут аб помсьце права, а не аб вымеру справедлівасьці. І дзіўна, што праўнік (п. Бітнэр зьяўляецца праўнікам) можа гаварыць аб помсьце права. Можа быць вымер справядлівасьці. (Голас на правіцы: „Калі права пакрыўджана, то яно помсьціцца»).

І вось у гэтай Віленскай справе выслана грамадзян за граніцу. Суду не распачалі, абвінавачаньня ніякога не прад'явілі, без дазнаньня выкінулі людзей, якія проста не падабаліся.

Мы з гэтай трыбуны вымагаем ад п. Міністра Унутраных Спраў і п. Міністра Справядлівасьці распачаць следства ў гэтай справе. Хай вызначаная камісія дазнаецца, як гэта ёсьць у сапраўднасьці. І калі тыя асобы вінны, хай распачнуць процім іх суд і суд выдасьць свой прыгавар, тым болей, што некаторыя ўжо з іх вярнуліся, а калі яны ня вінаваты, то ў такім выпадку павінны быць прыцягнуты да адказнасьці тыя паны.

Далей справа грамадзянства. Між іншым трэба адзначыць, што для стверджэння грамадзянства ў Польшчы істнуе 18 пастановаў, паводле якіх можна азначыць грамадзянства. Вось-жа кожны староста, кожны „кацык“ крэсовы азначае так, як яму падабаецца і людзі, якія, з дзеда-прадзеда жылі на гэтай зямлі, якія згодна з Вэрсальскім трактатам мусяць мець правы на грамадзянства польскае, але гэтага грамадзянства не атрымліваюць і выкідаюцца за граніцу. Пазбаўленьне грамадзянства і адбіраньне пашпартоў ад грамадзян Польскай Рэспублікі ёсьць асобным лагодным палітычным тэрорам, г. ё. засудзіць грамадзяніна на палітычную сьмерць.

А далей возьмем справы касьцельныя і царкоўныя. Тут практыка польскага ўрадаваньня такая, што зрывае лаўры мучальніцтва Зьверовічам, Грыневецкім, Роппам і інш. біскупам польскім, якіх вывозіў расейскі ўрад. Вось нядаўна гвалтам вывезьлі з Вільні эпіскапа Элеўфэрыя. (Голас: „Ня слухаў уладаў!“) Але-ж не з паліцыяй гэта робіцца і не вам так рабіць,хрысьціяне! Далей забралі гарадзенскага эпіскапа і цяпер яго перавозяць да якагась-ці манастыра, на шчасьце праваслаўнага, бо Элеўфэры пасаджаны ў манастары не праваслаўным а каталіцкім. (голас: „З манастыроў робяцца вастрогі“). Так, панове, гэткім чынам з манастыроў робіце вастрогі. Гэта ёсьць зьдзек над правамі чалавека.

А якая вялікая крыўда дзеецца Беларускаму народу, большая, як прымусовае адбіраньне зямлі, як зачыненьне школ! Тая крыўда, што дзеецца вядомай хваробай некаторых частак польскага грамадзянства: некаторыя слаі польскага грамадзянства хварэюць на ненавісьць. Ненавідзяць немцаў, ненавідзяць кожнага суседа, ненавідзяць расейца ненавідзяць украінца, ненавідзяць беларуса. (голас: «Няпраўда!») З прыемнасьцю прымаю гэтую заяву! Вось-жа, панове, лічу, што народ беларускі расьце ў нездаровых варунках і сам можа заразіцца ненавісьцяй.

Добра разумею, што ў пашырэньні гэтай ненавісьці ёсьць пэўная дэмагогія дэмагогія слаёў, што чуюць хуткі канец, іменна тых слаёў, якім з пад ног высоўваецца грунт, ёсьць гэта кляса земляўласьнікаў, яна чуе гэта і хоча абаперці ўсю сваю сілу і нават сваю здольнасьць да жыцьця на гэтай нацыянальнай ненавісьці. (Голас: „Нацыяналісты“). У мазгах, замарочаных ненавісьцяй, родзяцца надта небясьпечныя для польскай гаспадарственнасьці брэдні. Вось адна з такіх брэдняў ёсьць, што ня бачаць таго, што ёсьць, а з другога боку бачаць тое чаго няма. (Голас: „То-ж бо тое!“). Істнуюць беларусы, істнуюць украінцы, мы зьяўляемся довадам таго, што істнуюць, але вы гэтага ня бачыце, ня хочаце, бачыць, (Кс. Ольшаньскі: „Не“!). Дык ксендз гэтага ня бачыце? (Кс. Ольшаньскі: „Не!“) Дык дайце яму такія акуляры, праз якія-б ён бачыў. А ўрэшце, калі і ёсьць беларусы, калі і ёсьць якіясьці там украінцы, дык іх надта лёгка апалячыць... (Голас: „Мыляецеся!“)

Вось-жа, мае паны, цяпер ужо мінуліся тыя часы калі так лёгка, насільна пазбаўлялі народ яго нацыянальнасьці. Сам польскі народ ёсьць жывым прыкладам гэтага. Так-сама і Літва зьяўляецца надта добрым прыкладам таго, што пазбавіць народ яго нацыянальнасьці ня можна, а ўрэшце насколькі Польшча калісь-ці мела вялікую» асыміляцыйную сілу праз сваю шляхту і прыцягвала іншую шляхту да сябе, то цяпер магчымасьцей асыміляцыйных ужо няма. (Голас: „А чаму?“. А няма іх дзеля таго, што ня йдзе згодна з тымі прынцыпамі, якія абвяшчае: вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі.

Выбары разьбілі тыя брэдні, што няма украінцаў і беларусаў.Хто прайшоў з нашых беларускіх абшараў да Соймвкаго бачым? Бачым тых, што зусім выд-

---

— На, браце, хлеба кусок, калі ты галодны і ня будзь пустадомкам. Не забывайся, што пакуль маці жывець, яна—гаспадыня. Мы павінны яе слухаць і шанаваць. — сказаў хлебароб і палажыў перад наймітай хлеб.

Дзіка заблішчэлі вочы найміта, злосна пырнуў ён хлеб са стала і схваціўшы тапор зашыпеў, як гад падкалодны:

— Калі яна не перашкодзе, дык...

І замахнуўся на матку тапаром. У адзін міг хлебароб вырваў тапор і крыкнуўшы „Юда!“—хацеў адным ударам прыбіць брата.

— Каін! — сіпла прахрыпеў найміт.

Пачуўшы гэтае страшнае наіменьне хлебароб аж здрыгануўся, з аблзсіленай, апушчанай рукі высунуўся на падлогу тапор. Яго рыданьне прарвала часовую маўчанку.

Усё гэта бачыла прабуджаная крыкам маці. Незаслужаная крыўда і пякучы жаль прыдалі ёй моцы і яна зышоўшы з ложка, бледная як палатно, напоўжывая, працягнуўшы к небу кастлявыя рукі, праклала пракляцьцем маці абодвых сыноў: аднаго як вырадка за паняверу бацькаўшчыны, за жудасны намер забіць родную матку, а другога, — што не здалеў з чэсьцяй абараніць яе — праз жаласьць яго астаўся жывым страшны праступак і загідзіў, асьвячоныя працавітым жыцьцём сьцены прадзедаўскай хаты. Ах яна ня можа жыць з імі пад адной страхой і пойдзе жабраваць у чужых людзей зьмілаваньня. Лепш згінуць ёй у полі, не пахаўтуранай, як дамучываць свае апошнія дні ў лагве немачы і агіды.

І вышла хістаючыся, прыбітая горам удава з сваей хаціны, вышла ў сьвет шырокі шукаць свайго апошняга сына, адзіную надзею і радасьць. Цяпер Янук стаў ей найдаражэйшым, наймілейшым, Яна мусіць яго найсьці, каб прыгалубіць яго пажальбаваць у горы, яна выпрасіць у Бога сабе здароўя, каб незасмучаць свайго Янучка. Ах, каб жа ёй толькі знайсьці дарагога сыночка. Інакш і пасьля сьмерці ня будзе ёй супакою.

Вось так заўсёгды чалавек у горы шукае, прыдумывае сабе ў нечым збаўленьня, а хвальшывае гэтае збаўленьне няпэўна падтрымовывае і памагае кульгаць па шляху аж пакуль...

Але-ж адна бяда ня ходзе, другую за сабой. Толькі ўдава пакінула сваю хату, як падняхвалая навальніца. Гудзела неба, стагнала зямля. Сьвятло і цемра з сыканьнем і скрогатам пераплеталіся ў злосным змаганьні. Гатавалася, хвалявала паветра. І сярэд гэтай страшнай непагоды і бездарожжа чуваць быў кліч пакрыўджанай, пакінутай маці: сынку, дзе ты?.. І недзе ў глыбіне бурлівай ночы якочучы пераліваласся рэха: сынку дзе ты?

Доўга хадзіў Янук шукаючы такіх рэдкіх лекаў. Але ня толькі сьлёз ад шчасьця ды і самога шчасьця нідзе ня мог знайсьці. Усюды ён чуў толькі скрыпучы стогн і нараканьне, якія зусім ня былі падобна да пявучага шуму-гоману лесу і палёў. Янука што раз мацней пачаў апутываць дратаваны сум, што раз глыбей упівалася ў сэрца журба. Тут успомніў Янук, як ён, будучы яшчэ юнаком, еў з братамі з аднэй міскі і калі браты адганялі яго ад заціркі каб ім больш аставалася, дык Янук ішоў у лес, рабіў сабе жалейку і ў граньні забываўся аб голадзе. Вось і цяпер зрэзаў ён прыдарожную вярбіну старанна зрабіў жалейку ды і зайграў...

А калі кончыў граньне, дык пачуў сябе радасным, сьветазарным - так чароўная, жыцьцёдаўчая была гучнасьць жалейкі. І ня дзіва, бо з жалейкі адклікалася, пяяла душа яго матулі — жалейка была зроблена з вярбіны, якая вырасла на магіле без часу загібеўшай удавы Толькі-ж Янук гэтага ня ведаў. Узяўшы жалейку ён пашоў да людзей з пэўнай надзеей, што цяпер сваім граньнем дастукаецца ў сэрцах людзкіх сьлёз ад шчасьця.

Ой вельмі жорсткія сэрцы людзкія, каб іх чулымі гукамі ўзварушыць, вызваць рэха з затаённых куточкаў. Ой лішне шмат уплыло сьлёз на бяду-бедаваную, каб імі можна было асьвяціць нячаканае шчасьце, ой шмат яшчэ сонца зробіць дарогі, пакуль людзі глянуць душой і ўцямяць сэрцам.

І Янук змучаны неўдачай выняс сваю неўтомную веру ў бязлюдзьдзе, у глуш лясную, на заімшэлую руіну. Там, сеўшы пад аграмадным каменем, усей істотай сваей аддаўся творчасьці, пераліўся ў чулагучнае граньне, забыўся ў хмельных лятунках. Так было хараша гэтае граньне, што на камяні пад якім сядзеў Янук, выступіла брыльянцістая раса — камень заплакаў. Камень ажыў, загаманіў:

«Я акамянелы веліколюд плачу ад радасьці, ад шчасьця, ад хвалы, што моц мая магучая, моц важкасьці зямной не загінула, а стаўшы лёгкаукрылай, красатворчай, славіць славу талакі, мэціць к сонцу свой узлёт...»

Ня слухаў больш вялікалюда Янук, а пасьпяшыў збіраць сьлёзы ад шчасьця—як толькі чапнуў іх сквапнымі рукамі, дык сталося тое, што людзі называюць цудам. Янук стаў зьнікаць, сперша пераменіўся ў празрыстую сіняву, пасьля ў сьветлы слуп, а ўрэшце зусім счэз.

Так бывае з тым, чый творчы дух збірае плады— сьлёзы шчасьця,—ён уваходзіць у вечнае, сусьветнае.

Р. Юргілевіч.

Суліма.

Што такое „Wyzwolenie“ з беларускага пункту гледжаньня.*)

Ваенна-паліцэйскі кардон і акопы *Wyzwolenia*.

Можна спытаць: чаму-ж гэта на беларускім сялянскім рынку карысталася і карыстаецца ўдачамі паддзелка, — хай самая лепшая, а ўсё-ж такі бязумоўная паддзелка — Wyzwolenie?!

Прычына гэтага—ляжыць ня толькі ў якасьці спрытна зробленага фальсыфіката, але, галоўным чынам, у адміністратыўных варунках самага рынку.

Хто-ж ня ведае, што аўтэнтычны прадукт самастойнай палітычнай думкі — ўласнай беларускай нацыянальнай і сацыяльнай ідэолёгіі — проста не дапушчаўся польскай уладай на беларускі рынак?!

Паміж беларускім інтэлігентам, — тварцом духоўных вартасьцей, арганізатарам нацыянальнай сьвядомасьці народу — і народнымі масамі, з самага прыходу на Беларусь польскай улады быў працягнуты ваенна-паліцэйскі кардон акупацыйнага рэжыму....

Беларускія народныя масы жылі, як бы за загарадкай з калючага дроту, прыступ за якую

(*Гл. „Н. Б.“ № 5.

разна йшлі пад беларускім флагам і зноў бачым „Wyzwolenie“, гэта тых, якія, думаю, шчыра абвяшчалі свабоду народам, тых, якія карысталіся беларускаю мовай, тых, якія абяцалі белраусам тэрыторяльную аўтаномію. (п. Рудзіньскі: «Польшча павінна быць краем свабоды, а не нацыяналізму!» Вокляскі. П. Рудзіньскі: „Польшча ёсьць рэспублікай вольных народаў!“ Вокляскі.]

Вось-жа на гэтых лаўках „Wyzwolenia“ ёсьць так-сама некалькі беларусаў нават праваслаўных. [Вітос: Вось навасць! ня ведаў] Адазвіцеся вызваленцы, ці ёсьць сярод вас беларусы? [Галасы: Так, так].

Дык вось-жа з беларускіх абшараў прашлі беларусы, выключаючы Вільню, дзе ў зьвярынцу віленскага нацыяналізму гнездзіцца «Хіена» і з гэтага зьвярынцу маем тут некалькі экзэмпляраў.

Калі лопнула адна ілюзыя, пачалі будаваць другую, надта небясьпечную. Прыдумалі так званую нацыянальную польскую большасьць. У суботу мелі прыемнасьць чуць цэлую тэорыю аб гэтай польскай большасьці з гэтай трыбуны ад паважанаго праф. Гломбінскага. Каліб гэта гаварыў не прафэсар не дзівіўся-б, але гаварыў гэта чалавек алукаваны і гаварыў, што ў найважнейжых польскіх справах, могуць рашаць толькі адны палякі. Гэткімі паняцьцямі апэруе гэты, як бы ні было, паважны чалавек —«справы найважнейшыя і польская большасьць». Справы найважнейшыя... Якія гэта найважнейшыя справы? [Голас „Дзяржаўныя!“] А дзе ёсьць справы недзяржаўныя. Ці паны прыходзіцце да Сойму праводзіць час у буфэце, Мы прыходзім займаецца дзяржаўнымі справамі. [Голас: „У імя Грумбаўма?„] Не, паночкі, ў імя народу Беларускага, як грамадзяне Рэспублікі. Мы прыходзім першы раз да гэтага Сойму і прыглядаемся крыху здалёк і збоку, дзе ёсьць гэтыя нацыянальная большасьць, вы ўсе [паказвае направа] калі верыць газэтам і правіцовым і левіцовым, усе прадстаўляецца 2 мільёны выбаршчыкаў, другія польскія партыі — прадстаўляюць 4 мільёны выбаршчыкаў. А гдзе-ж рэшта? Гэта—брэдні, якія мае ксёндз, што стаіць перадамною, які гледзечы, ня бачыць, а слухаючы, ня чуе. Мусіць мае вочы не для таго, каб глядзець, а вушы — каб слухаць. (Голас „Добры тэалёг“).

Не праміну так сама і дагавару з вялікімі дзяржавамі, так званага трактатуў аб нацыянальных меншасьцях. У гэтым трактаце ў арт. 6 гаворыцца: „Прыналежнасьць польскую набывае з самага права, праз самы факт ураджэньня на тэрыторыі Польшчы, кожны, каму не прысяугоўваэ карыстаньне з іншай прыналежнасьці“. Арт. 7 гаворыць. „Усе польскія грамадзяне бяз разьніцы расы, мовы альбо религіі будуць роўныя адносна закону і карыстаццa будуць з тых самых праў цывільных і палітычных“. На падставе гэтага права знаходжуся ў Сойме, але гета панам не падабаецца.

Хочаце зьмяніць Канстытуцыю, аб гэтым пішаце выразна; хочаце так зьмяніць выбарную ардынацыю, што калі нас яна цяпер крыўдзіць, дык паменшыць яшчэ нашы правы, зусім адабраць іх. Дык вось, што датычыцца трактату; разумею, што польскім патрыётам не падабаецца, што палякаў прымусілі яго прыняць, а прынялі і ратыфікавалі яго, як раз вашы прыяцелі і калегі, пане Гломбінскі. Добра-б было каб гэты трактат быў накінуты не аднэй Польшчы, але і тым дзяржавам, якія накінулі яго Польшчы.

Але вы, панове, робіце рэчы ня толькі ганьбячыя польскае імя, але проста небязпечныя для самага істнаваньня Польшчы. Вы сваімі паступкамі хочаце даказаць, што дзяржавы навязаўшыя гэты трактат, мелі слушнасьць. (Голас: „Добра сказана“. п. Глонбінскі: „Вам ніхто правоў ня адбірае“). Далей, вашая тэорыя аб большасьці, аб тым, каб большасьць польская рашала ў дзяржаўных справах, гэтая тэорыя не згаджаецца з разуменьнем аб сучасным гаспадарстве, бо сучаснае гаспадарства павінна забясьпечываць усім грамадзянам наагул і кожнаму паасобку, не залежна ад расы, ад рэлігіі, ад пагляддаў — роўнасьць і роўныя правы. Гаспадарства толькі тады можа істнаваць, толькі тады можа быць цярпіма, калі роўна будзе апекавацца ўсімі нацыянальнасьцямі, не перашкаджаючы нікому. хто захоча разьвіваць сваю мову і культуру. (Голас на правіцы „Маецеж-ж Канстытуцыю“). Так, ал калі гаспадарства гэтых запаведзей ня выпаўніць — траціць апраўданьнэ сваяго істнаваньня, становіцца прычынай нязгоды людзкасьці, будзе абвінавачана судом роду чалавечага і змушана будзе альбо перастаць істнаваць, альбо адмовіцца ад выкананьня такой немагчымай палітыкі. (п. Глонбінскі: „Хай пан скажа гэта немцам і русінам. Здаволеньне на правіцы) Паны сьмеецеся! — над сабою сьмяецеся! (Брава і вокляскі на беларускіх лаўках). Тое, што я сказаў — не мае словы: гэта ёсьць словы, якія прачытаў з кніжкі вядомага польскага пісьменьніка Вайцеха гр. Дедушыцкага. (Галасы на лаўках беларускіх і левіцы: „Слухайце, слухайце! Яны ня знаюць гэтага!“)

Вось так разумею заданьня сучаснага гаспадарства і заданьня Польскай Дзяржавы, тым болей, што канстытуцыя гэтай Дзяржавы можа служыць прыкладам дэмакратычнай канстытуцыі, ў іншым выпадку можа і нас задаволіць. Робіце нам закіды ў нелояльнасьці адносна польскай гаспадарственнасьці і чуем заўсёды пытаньне ці стаім на грунце польскай гаспадарственасьці ці не. Вось-жа зусім шчыра і яўна, з поўнай адказнасьцю за свае словы, адказываю, што пачуваемся да еднасьці з цэлым Народам Беларускім... (Голас: Якім!) Беларускім... Народ і дзяржава, гэта зусім, што іншае — а Народ Беларускі мае выразныя незалежніцкія тэндэнцыі... (Крыкі. п. Рудзінскі; „Ці вы, панове, стыдаецеся сваей польскай незалежнасьці? Усякі-ж народ мае права да незалежнасьці, як палякі, так і беларусы,,). (Маршалак звоніць). Незалежнасьць гэтую глыбока ў сэрцу хаваем і пястуем, але зьяўляемся лояльнымі грамадзянамі. Польскай Дзяржавы, можа болей, чым многія з тых паноў, што сядзяць тут (паказвае на права); бо ня робім і не маем замеру рабіць ніякіх чынаў якія могуць быць караныя законамі Рэспублікі, іначай кажучы, разумеем гэтую справу эвалюцыйна, а не рэвалюцыйна, — і людзей — сапраўдных патрыотаў, людзей сумленных гэта павінна задаволіць (брава на лаўках меншасьцяў). Вось-жа, панове, мы шанавалі вашу барацьбу за незалежнасьць, але і вы мусіце ўшанаваць нашу. Мы ня хочам быць падобнымі да тых... (перабіваюць з права). Хай пан не адзываецца з якой рацыі?... Ня хочам быць падобнымі да тых, якія хоць у добрай веры, пане Гарусэвіч; і хоць з замераў патрыятычных, але аблудна пасылалі вернападданчыя дэпэшы да Пецярбургу ў той час, калі іх зусім маглі і не пасылаць. (Брава на левіцы. Маршалак звоніць. Рух на левіцы). Панове, мы ня хочам быць падобнымі да тых... (Шум на левіцы.) Хай паны дазволяць гаварыць (Зварочваючыся да левіцы) Мы ня хочам быць у сытуацыі... (Крыкі, Маршалак: Прашу супакоіцца)... нязручнай сытуацыі, тых, якія казалі: „Пры табе стаімо і стаяць будзем, Найясьнейшы Пане“. (Крыкі. Маршалак звоніць.) Урэшце, панове, думаю, што гэтых колькі слоў для парадачных людзей хопіць, але мог-бы даць прыклады для ляпейшага зразуменьня. Вось-жа, калі, напрыклад, кс. Лютаслаўскі ёсьць шчырым каталіком... (п. Хаціньскі: „Хай пан пачакае, пакуль прыйдзе — я яму скажу“. Голас: „Без асабістых прытыкаў“). Я кажу толькі кампліменты... Вось-жа калі кс. Лютаслаўскі ёсьць шчырым каталік м, то можа думаць, хоць-бы ў самай далёкай будучыне, аб тэократыі. (Хяціньскі: Глупства пан гаворыш!“) Таварышы соцыялісты мусяць мець ідэалам — саюз сацыялістычных рэспублік, але ніхто проціў кс. Лютаслаўскага не распачне за гэта працэсу; альбо сацыялістам .. так сама ня знойдзецца ніхто такі разумны альбо неразумны, каб распачаць працэс. Прыходзім да Сойму не дзеля таго, каб забаўляцца ў славесныя азначэньня; ці Польская дзяржава нацыянальная, ці складаецца з многіх нацыянальнасьцяў? Што-ж, калі панам падабаецца сказаць, што нацыянальная, згаджаюся — хай будзе нацыянальная. Ня ў гэтым справа, бо я рэальных нацыянальных стасункаў істнуючых у Польскай Дзяржаве, лічэбных стасункаў аднэй нацыянальнасьці да другой зьмяніць ня магу. Трудна адказаць; гдзе канчаецца дзяржава нацыянальная, а пачынаецца складаючаяся з многіх нацыянальнасьцяў!

Пакідаючы гэтую слоўную гутарку, скажу папросту з чым мы прыходзім, як грамадзяне Рэспублікі, і чаго мы хочам. А гэтыя жаданьня вось якія: Стоячы на грунце тэрыторыяльнай аўтаноміі з Краёвым Соймам у Вільмі, дамагаемся: Найхутчэйшага спыненьня штучнай каланізацыі і ліквідацыі вайсковага асадніцтва; нацыяналізацыі ўсіх лясоў і безадкладнае выданьне закону; рэгуліруючага вырубку лясоў з мэтай зазабясьпячэньня краю ад зьнішчэньня; увядзеньня ў жыцьцё зямельнай рэформы, якая-б насамперш забязьпечывала інтарэсы мяйсцовай безземельнай і малазямельнай людносьці, надзеляючы яе зямлею бяз выкупу: (Голас; „Бяз выкупу?“) Так, бо калі адных надзеляюць бяз выкупу, то і другім тое самае належыцца; зварот рэпатрыянтам канфіскаванай дзяржаваю зямлі; адбудова зруйнаваных вайною вёсак і мястэчак. Дапамога рэпатрыянтам; свабода арганізацый у эканамічным жыцьці. Безадкладнае выданьне законаў, забясьпечываючых беларускай людносьці культурнае і прасьветнае разьвіцьце, дапушчэньне беларускай мовы у адміністрацыю і суд, няўмешываньне адміністрацыйных уладаў у рэлігійнае жыцьцё“.—Умешываюцца ня толькі да царквы праваслаўнай, але і царквы каталіцкай. (п. Рудніцкі; „Няма каталіцкай царквы“)... Касьцёла каталіцкага. Велімі перапрашаю Учуся польскай мовы і гэта можна мне выбачыць, у праціўным разе папрашу, каб дазволілі мне гаварыць пабеларуску (Маршалак; Гэтага не дазволю. п. Рудніцкі; „А пажыдоўску пан умее?“)

Хачу адзначыць на гэтым мейсцы, што гдзе ёсьць ксёндз—паляк, дык ям можна вясьці ў касьцёле ўсякую агітацыю, а калі ёсьць ксёндз — беларус дык рэвіровы прыходзіць з карткай і забараняе ксяндзу гаварыць казаньня ў беларускай мове.

дазваляўся толькі па „пшэпустках“, у зятым у спадку прыкладу і прататыпу ўсіх пазьнейшых акупантаў — нямецкай улады.

Усялякая ня толькі нацыянальна-палітычная, але і культурна-прасьветная праца ў нашым краі была выключана для беларуса. Побач з сацыяльнай рэпрэсыяй у краі панавала самая бязстыдная паланізацыя.

Занадта поўнае было упаеньне Польшчы сваім нацыянальна-дзяржаўным уваскрасеньнем з мёртвых і зваротам „з прадвеку польскіх земляў“ — ў тым ліку і Беларусі!

І проціў гэтага рэжыму паўсямесных рэпрысый мы ня чулі ні аднаго пратэсту з боку цяперашніх прыяцеляў Беларусі з партыі Wyzwolenie. Толькі ў прадбачаньні новых выбараў у Сойм пачуліся такога гатунку прамовы, як прамова пасла Рудзінскага ў траўні 1922 г.

Ды й ці можна было чакаць ад іх гэтых пратэстаў, калі як раз гэты рэжым адчыняў для іх вольнае поле дзейнасьці ў Беларусі, калі якраз гэты мытна-паліцэйска-ваенны кардон ствараў для польскіх людовых партый з тым жа Wyzwoleniem на чале, няспрэчны, спакойны манаполь, на беларускім народным рынку..

За час гэтага манаполю, пры атсутнасьці усялякай сапраўдна-беларускай канкурэнцыі, Wyzwolenie-трэба аддаць яму поўную справядлівасьць-зрабіла вялікую працу.

За гэты час - задоўга да таго, калі абвяшчэньне выбараў дало магчымасьць беларускаму дзеячу адкрыта і свабодна падыйсьці да беларускага народу, — спрытныя і умелыя працаўнікі партыі Wyzwolenie занялі мейсцы, раскінулі па ўсяму Краю сеткі сваіх арганізацый, умацавалі свае пазыцыі, заваявалі пэўнае даверыя беларускага селяніна.

Забіты і запуджаны беларускі хлебароб з надзеяй і верай глядзеў і слухаў, як які-небудзь спрытны і хітры гастрлёр Wyzwolenia ў ролі нятыкальнага дэпутата Варшаўскага ці Віленскага Сойму, дэманстратыўна рэзка крытыкаваў усесільныя мяйсцовыя сельскія ўлады, абяцаючы запісаўшымся ў партыю ўсялякія дабрадзействы і сваю высокую апеку.

Такога гатунку тэатральнымі эфэктамі утвараўся бутафорскі орэол партыі.

Але ўсе мы добра ведаем, што далей гэтых тэатральных жэстаў справа ня йшла, што Wyzwolenie пальцам аб палец ня ударыла дзеля запраўднага вызваленьня беларускага селяніна ад таго душачага рэжыму, ў якім ён жыве да гэтага часу...

Дык вось трэцьця, прычына удач партыі ў нашым Краі, вялікая пераважнасьць яе перад нашымі наскора заснаванымі камітэтамі, зьяўлялася ў тым, што, загадзя заняўшы мейсца, партыя Wyzwolenie, к дню уладала густою сеткай гатовых арганізацый і нашым аддзелам прыхадзілася, так сказаць, выбіваць вызваленцаў з тых траншэяў і акопаў у якіх тыя пасьпелі моцна засесьці..

А носьная свабода выбараў — той мінімум прызваітасьці, які, дзеля Эўропы, быў сяк-так застасаваны ў часе выбарнай кампаніі, - і тыя мізэрныя срэдствы, на якія ўсёж-такі ўздабыўсяЦ.Б.В.К у першы раз далі магчымасьць зьвязаць з нацыянальна-палітычным цэнтрам шырокія народныя масы, разьвіць пляновую агітацыю ўва ўсіх 9 беларускіх акругах.

Гэтая магчымасьць і распачала *працэс прабуджэньня самадзейнасьці апутанага* Wyzwoleniem *беларуса.*

І тут мэты, характар, мэтады, тэмп і вынікі барацьбы нашай з Wyzwoleniem, — розныя ў розных частках беларускай тэрыторыі, даюць матэр'ял для надзвычайна цікавых і важных вывадаў.

V. Заданьне выбарнай кампаніі і барацьбы з *Wyzwoleniem*.

Выбары, паставіўшы перад беларускім селянствам практычнае заданьне выбраць сваіх прадстаўнікоў у Палаты Польскай Рэспублікі, высунулі на першы плян якраз гэты *важнейшы прынцып уласнага, незалежнага прадстаўніцтва, поўнага самаазначэньня,* як найболей важны практычна і найболей дарогі ідэолёгічна прынцып для нацыянальна адраджаючагася народу.

Сам беларускі народ захацеў і па ўласнаму праву і на падставе даных яму Польшчай Выбарнага закону і Канстытуцыі, *выступаць і гаварыць за самога сябе.*

І ён адтрымаў гэтае права гаварыць аб самым сабе зьяўляючыся для сябе самамэтай, ня хочучы ні для каго служыць спосабам, — тым самым „канём“, аб якім так выразна гаворыць Wyzwolenie, і на якім яно само езьдзіла і ўехала да Сойму.

Ен зусім ня хацеў быць ні „выбарным мясам“ для living рознага сорту „мураваных“ палітычных спэкулянтаў і кар'ерыстаў, ні паслушным матэр'ялам крэсовай палітыкі, якая корміць жывою крывёй яго роднага Краю польскі цэнтр.

Ен зусім ня хацеў, як гэта ні страшна гучыць для польскага вуха, быць простым будаўляным матэрыялам у руках дрэнных будаўнічых так званай „польскай гаспадарсьцвеннасьці“, якую ён, па праву, духу, сэнсу, і літары дэмакратычных выбраў, *цяпер заклікаўся сам судзіць,* якая па трафнаму выражэньню расейскага паэта Пушкіна, да гэтага часу паварачывалася да яго толькі сваёю „стальною шчэцінай“.

Забыты дагэтуль усімі польскімі партыямі забіты і катуемы драганадамі акупацыйнага рэжыму, разлагаемы нікуды - нягоднай мяйсцовай адміністрацыяй, што прызнана цяпер такой аўтарытэтнай асобай, як цяперашні Старшыня міністраў генарал Сікорскі, — беларускі народ атрымаў як маральнае, так і юрыдычнае права гаварыць і думаць толькі аб сабе, аб сваіх крыўдах і зьдзеках, аб сваіх патрэбах і надзелах, — без усялякай „палітыкі“ і „дыплёматычных“ прамаўчаньнях аб тым, што над ім выраблялі за ўсе гэтыя 4 гады...

Гэтага за беларускі народ не зрабіў-бы і ня зробіць ніхто,—ня зробіць ні адзін „адвакат“, ніводная чужая нацыянальнасьць; ня зробіць, зразумела ні адзін польскі адвакат, — ні водная польская партыя, якія, як мы гаварылі, ўсе прылажылі сваю руку, ўсе вінаваты ў 4 гадовых цярпеньнях беларускага народу, — ўсе павінны сесьці цяпер у новай Палаце Рэспублікі на лаўку падсудзімых, як праступнікі перад беларускім народам.

Кожная польская партыя павінна будзе ў тэй ці іншай меры прамаўчаць аб тым, што імем польскай гаспадарсьцвеннасьці тварылася ў нашым Краі, прамаўчаць аб сваей уласнай прошласьці ў Краі, аб сваім маральным ці [illegible]тычным удзеле у гэтай благой і нера[illegible] справе.

Няўмешываньне адміністрацыйных уладаў да рэлігійнага жыцьця, адміністрацыя з мяйсцовых элемэнтаў, увядзеньне дэмакратычных прынцыпаў, суда прысяжных і выбарнасьць міравых судзьдзяў, урэшце тэрытарыяльная арганізацыя войска.

Пераходжу цяпер да экспозэ п. Старшыні Міністраў. Вельмі шмат маем незаспакоеных крыўдаў, шмат маем патрэбаў, але аб гэтых нашых патрэбах п. Старшыня Міністраў у сваім надта вычэрпываючым у іншых галінах экспозэ—гаварыў надта мала. Успомніў толькі, што будзе прытрымлівацца канстытуцыі. У нас вось як гаворыцца пабеларуску; абяцанка — цацанка, а дурному радасьць Але мы з гэтага ня цешымся і добра ведаем, што канстытуцыя—канстытуцыяй, а жыцьцё застаецца жыцьцём і што ў жыцьцё гетая канстытуцыя поўнасьцю не праводзіцца. Пан Старшыня Міністраў таксама ня даў, паскольку можна судзіць з яго экспозэ, ніякіх гарантый, апрача абяцанак, што канстытуцыя будзе праведзена ў жыцьцё. Адным словам нічога рэальнага нам ня сказаў. Праўда мы чулі кампліманты аб нашым жаўнеру, што ёсьць храбры, панятны, кампліментны надта салодкія для нашага народу, але прыпушчаю, што ў Дзяржаве Польскай ня толькі маем права быць гарматным мясам, але таксама—права да дабрабыту, якое можа даць дзяржава. І аддаючы Дзяржаве сваю маемасьць, аддаючы дзяржаве сваё жыцьцё, мусім мець і правы. Як да іншых урадаў, так і да Ураду п. генерала Сікорскага маем асаблівае перакананьне, маем няпэўнасьць Калі польская партыі ня хочуць узяць поўнай і яўнай адказнасьці за гэты ўрад, то мы ня хочам браць ніякай адказнасьці і мусім зазначыць, што праз свае адносіны да ўраду ня хочам выклікаць ніякага крызысу, забурэньняў, якіх каб ня было.

У адказ на пратэст пасла Дашынскага, быццам ён не казаў: „Мы вас падзялілі, бо мелі сілу, як вы будзеце мець сілу, дык нас падзеліце“, пасол Тарашкевіч прачытау на чарродным паседжаньні пісьмо В. Іваноускага, які пацьвярджае, што гэтыя словы былі сказаны Дашынскім у лютым месяцу 1920 г. у памешканьні Рады Міністрау (Варшава) у прысутнасьці К. Тэрэшчанкі, Л. Дубейкоускага і напісаўшага пісьмо В. Іваноускага.

Голас выбаршчыка.

Мы выбаршчыкі дачакаліся ўжо калі нашыя прадстаўнікі у Польскім Сойме пачалі выяўляць волю беларускага народу. Дачакаліся і засумавалі.

Перш-на-перш учасьце ў выбарах сучаснага Прэзыдэнта, маршалка Сойму і падача галасоў за габінэт ген. Сікорскага не знаходзяць спачуцьця сярод нас выбаршчыкаў. Калі немагчыма было выбраць больш прыязных, спачуваючых для нас, дык ці ня лепш было-б нашым паслам, як і належа добра выхаваным гасьцям (а нашы паслы хочуць быць ветлівымі і прыемнымі), на гэты час пасядзець ціханька ў чужой гасподзе ня мешаючыся ў некарысныя нам справы, каб пасьля на нашыя закіды мог наш пасольскі клюб сказаць: мая хата з краю, я нічога ня знаю.

Праўда, генарал Сікорскі хітры. Сказаўшы бацькаўскае настаўленьне: „Ніколі ўрад ня будзе слабым супроць тых, хто не захоча быць паслухмяным сыном Рэчыпаспалітай“, пасьпяшыў закінуць у Б. П. Клюб кручок, а на кручок, па старапольскаму звычаю, уздзеў ласыя абецанкі і нашыя паслы клюнулі. Адным словам пагутарыўшы можна згаварыцца. А там усё пойдзе як па масьле. „Каб толькі ня было ніякіх крызысаў забурэньняў“.

Але я мушу разбудзіць ад салодкіх думак і папярэдзіць, што мы выбаршчыкі гэтых ласых абецанак ня бачым, а „бацькаўскае“ настаўленьне па старому адчуваем, хоць мы цішэй вады, ніжэй травы. Школ не даюць, палітычныя рэпрэсыі ня сьціхаюць, калянізацыя шырыцца і г. д. Адначасна хачу прыпомніць, што мы сваю ідэю незалежнасьці ня толькі „хаваем і песьцім у сваім сэрцы“, але просім вас паслоў як асоб нятыкальных, сьмялей і з гордасьцяй выяўляць яе, узгадовываць і грамчэй паведамляць сьвет аб тым, што слова незалежнасьць першае у нашага дзіцяці і апошняе у старых.

І калі закрануў гэтую сьвятую для нас справу, дык хачу тут спытаць чаму ў прамове грам. Тарашкевіча не пачулі мы аб юрыдычнай аснове ў маштабе міжнародным аб прыналежнасьці Заходняе Беларусі да Польшчы. ці хаця аб тэй аграмаднай тэрыторыі ад лініі Кэрзона да лініі Дмоўскага. іначай ад лініі па Версальскаму міру да лініі па міру Рыжскаму? Ці-ж гэта не права нашае, ці-ж гэта не абавязак нашага беларускага прадстаўніцтва ў польскім Сойме? Ці ж можна было праходзіць моўчкі каля гэтага так важнага палітычна-дзяржаўнага пытаньня?

Адно выяўленьне нашых крыўд і крытыка «крэсовай» адміністрацыі ня ёсьць уся наша воля. Добра крытыкуе навэт і польская партыя Вызволене. Але нашыя патрэбы ідуць шмат далей чым паноў вызваленцаў. Нашы словы павінны вырывацца з глыбіны доўга мучанай душы, а значыць трэба быць рашучымі і патрэбуючымі.

Мы народ не загартованы, не вышкалены ў палітычнай барацьбе і дзеля таго трэба наскрозь бачыць і моцна трымацца, каб захавмаць адналітасьць, не разменяцца, не супакоіцца на дробных канцэсьях.

Украінцы ў Галіччыне чатыры гады, ірландцы ўжо колькі вякоў ліюць кроў за свае народныя ідэалы, а вам пане Тарашкевіч, калі рыхтуецеся ісьці эвалюцыйным шляхам дык трэба больш цьвёрда ступаць і непамалу завіхацца, бо мы ведаем з практыкі жыцьцёвай, што нічога няма горшага як ждаць і даганяць.

Ну, але першы блін комам.

Выбаршчык.

****

Бібліяграфія.

„Строма“ — Уладзімер Дубоука.

Сярод беларускіх лірычных паэтаў ўстанавіўся звычай заўсёды браць дужа сумны, тужлівы, безнадзейны тон. Гэта сталася як бытцам традыцыяй. Дый яно зразумела; адбіваючы пераважна тыя настроі, якія родзіць акружаючая сучаснасьць, нашы лірыкі не знаходзяць другіх тонаў.

Тым вялікшую ўвагу зварочае на сябе кожын твор, у якім чуецца новы, сьвежы павеў, новыя тоны. Не стагнаць нам трэба, не пяяць аб нашай бядзе і горы, а будзіць сілу жыцьцёвую, шукаць у жыцьці якраз таго, што ў нас адбіраецца. Нельга жыць аднабока, вечна ў адным настроі. Жыцьцё гэтага ня цярпіць, яно лішне многагранная, лішне багатае ў фарбы і тоны, каб здаволівецца нечым шэрым, бязрадасным.

Невялічкі зборнічак вершаў „Стромы“ Уладзімера Дубоўкі якраз зрывае сувязь з традыцыйным стагнаньнем. На вялікі жаль, нам невядама, дзе жыве новы аўтар беларускі, — але той дух, якім праніқнуты яго вершы, прымушае думаць, што пісаны яны не пад цяжкім ярмом чужацкае ўлады. Столькі тут размаху, столькі моцы і веры ў сваю сілу і сілу народную! Паэт верыць у сьветлую будучыну Бацькаўшчыны і „не жальбуе, тых дзянькоў не шкадуе, што жыцьцё даўно разьвеяла, як дым“. У ім чуэцца маладая нарастючая сіла, ня зьвязаная з старымі перажыткамі, а ён зварочаецца да адраджэнскае моладзі з закліканьнем;

Маладое пакаленьне,
Прачынайся, час прыйшоў!
Залатое Адраджэньне.
Кліча ўсіх пад родны сховў.

Нешта сьвежае, запраўды новае нясе пясьняр. І калі маладое пакаленьне беларусаў будзе такім, якім прадстаўляецца аўтар „Стромы“, дык можна яго толькі шчыра прывітаць.

„Строма“ выдана вельмі пекна, і вонкавы выгляд адпаведае зьместу. Праўда часамі верш крыху кульгае (у рытме), але нет ведама, ці то віна аўтара, ці недагляд рэдактара. Затрымлівае на сябе ўвагу мілазычнасьць верша, ды такія гукавыя эффэкты, як прыкладам, у вершы на стр. 24:

Мітусіцца лістота мяцеліцай—
Мігульжынная, быццам дзьвіна.
Па аселіцы лёнам пасьцеліцца,
Завіхрыцца кваціста яна...

Шмат сьмелых зваротаў, сьмелых сукладаў слоў. у чым бязумоўна адбіваецца псыхалёгія аўтара. А ўсё гэта разам робіць зборнічак Уладзімера Дубоўкі цэнным і годным увагі.

У зборнічку ўсяго восемнаццаць вершыкаў. Жменя невялічкая. А ўсё-ж ужо па гэтай першай спробе можна судзіць, што новы паэт можэ даць шмат яшчэ цэннага нашай літэратуры.

Ант. Навіна.

****

Дописы.

Права дужэйшага.

У Язьненскай гміне, Дзісьненскага павету быу выбраны гміннай радай на войта мясцовы усімі паважаны С. Мятла-Мятлёнак, але павятовы стараста выбары не зацьвердзіу і назначыу войтам шляхціца Спірыдовіча, які мае заплютаную прошласьць, а заступнікам войта вядомага тамашняга спэкулянта Багуцкага.

Z.

У Глыбоцкай гміне, Дзісьненскага павету з радных гміны быу выбраны войтам Александр Зеваліч, але старасту не даuспа-

---

Толькі сам беларускі народ, сам пацярпеўшы можа без староннных памеркаваньняў. толькі з аднэй думкай аб спыненьні крыўдаў, аб задаваленьні за старыя праступленьні, выступіць і публічным абвініцелем і грамадзкім ісцом адносна таго, што завецца „польскай гаспадарсьцвеннасьцю“..

Вось у імя свайго „права на гнеў“ і йшла ў нас заядлая барацьба на выбарах з усімі партыямі, а—болей усяго—з самым страшным з самым блізкім да народу ворагам—Wyzwoleniem.

Заядлая выбарная кампанія закончылася выбарам паўтара дзесятка запраўдных прадстаўнікоў беларускага народу ў Палаты Рэспублікі.

Ці лічыць гэта перамогаю!

І так і не.

Як першая ўдача на тым цярністым шляху, які прадстаіць беларускаму народу, пакуль ён ня дойдзе да поўнай перамогі над сваімі ворагамі, гэтая ўдача можа лічыцца *першай вялікай перамогай*. Ува ўсякім выпадку пачатак барацьбы суліць многае ў далейшым.

Але калі мы ўспомнім, што з паўсотні мандатаў, якія прыходзяцца на беларускія тэрыторыі, дзе беларускі народ зьяўляецца ня „меньшасьцяй“, а наадварот аграмаднай большасьцяй, толькі паўтара дзесятка мандатаў атрымаў сам дэмакратычны гаспадар Краю—беларускі хлебароб, а да двух дзесяткаў адно толькі Wyzwolenie, дык флаг пабеднага аптымізму прыдзецца крыху спусьціць.

Ува ўсякім выпадку аснаўным фактам зьяўляецца той, што пабеду на выбарах нам прышлося дзяліць з партыяй Wyzwolenie. Чым азначылася гэтая ўдача Wyzwolenia мы ўжо гаварылі.

Цяперь нам трэба дасьлядзіць тыя бліжэйшыя варункі рэалізацыі гэтай удачы, азначыўшыя ў адных акругах, у адных выпадках нашу перамогу, ў другіх большую ўдачу нашага праціўніка. Як агульнае, надта важнае для нас, беларусаў, зьявішча, можна сьцвердзіць, што нават у мейсцох, дзе праціўнік наш акапаўся наймацней, зьяўленьне нашых агітатараў выклікае зараз-жа рэакцыю проціў Wyzwolenia.

Зьяўленьнем запраўднага нацыянальнага-сацыяльнага прадукта на беларускім народным рынку, як сказана, зараз-жа пачынаецца прагрэс выцясьненьня фальсыфіката. Гэтае зьявішча—зусім агульнае, паўсяместнае; працэс начынаецца і працякае ўжо проста сіламі ўнутранай праўды і запраўднасьці паўнацэннага прадукта ў параўнаньні з паддзелкай, фальсыфікацыя якой адразу кідаецца ў вочы разбуджанаму спатканьню праўды з фальшай крытычнай сьвядомасьці беларускага хлебароба.

Заданьне было толькі ў тым, каб усюды ўва ўсе куткі нашай мейсцамі непраходнай у восень Беларусі запраўдны прадукт меў магчымасьць пранікнуць, і ў тым, каб ён пранік туды заўчас, каб мець час выціснуць паддзелку з рынку да мамэнту галасаваньня.

Ні першае, ні другое заданьне, зразумела, не маглі быць выпаўнены поўнасьцю: ні карoткі прадвыбарны пэрыод, ні абмяжованнасьць срэдстваў не давалі магчымасьці поўнасьцю вырашыць заданьне.

Але што працэс выцясьненьня начаўся і з тэй ці іншай хуткасьцю працякаў у зусім вывыразным кірунку, у гэтым ня можа быць ніякіх сумлеваньняў: гэтае прызнаюць, як убачым далей, нават самі нашыя праціўнікі, самі „беларусы“ з Wyzwolenia.

Цяпер нам для аканчальных вывадаў застаецца яшчэ разгледзіць варункі і прычыны рознай скорасьці адзінага працэсу ў рознага роду беларускай сялянскай грамады.

Як мы гаварылі працэс выцясьненьня эрзатца з выбарнага рынку нашым прадуктам у адных мяйсцох пасьпеў і закончыўся да дня галасаваньня бадай поўнасьцю, азначыўшы там высшую меру нашай перамогі, як напр. у Навагрудчыне; ў другіх мяйсцох ён толькі начаўся і працякаў надта паволі для таго, каб к мамэнту выбараў даць сьпелы сьвядомы плод палітычнага рашэньня.

Калі аставіць у старане выпадкі, калі ў тую ці іную мяйсцовасьць нашыя агітатары зьяўляліся занадта позна ці зусім ня зьяўляліся, астаўляючы вызваленцаў як бы адзінымі пеўнямі ў катуху, дык прычыны розных скорасьцей паказанага працэсу зьяўляецца ў тай галоўнай і важнай розніцы, якая дзеліць усю беларускую масу на дзве няроўныя часткі: на каталікоў і праваслаўных.

Як можна-б было загадзя абмяркаваць—галасаваньня толькі падтвярждаюць гэтае—*працэс выцясьненьня польскай партыі* **Wyzwolenia** *з беларускага рынку адбываецца тым павальней, чым мацней у даным раёне ўплывы паланізму*. А дзеля таго, што паланізацыя здаўна адбывалася сіламі і срэдствамі галоўнымі чынам каталіцкага касьцёлу, дык можна сказаць apriori, што каталіцкая частка Беларусі безпараўнаньня трудней растаецца з паддзелкай Wyzwalenia, чым частка праваслаўная.

(Далей будзе)

З індускіх пагаворак.

I

Слухай голасу народа
ён найболей значыць!
Скажа, дзе ёсьць сварка, згода —
Слухай голасу народа!
Голас гэты — як прырода:
кажа, чуе, бачыць —
слухай голасу народа:
ён найболей значыць!

II.

У тым краю, дзе дурні пануюць,
лад і дабро хутка гіне,
бо хочучы дабра — руйнуюць,
ў тым краю, дзе дурні пануюць.
Так край марнаваць не шкадуюць—
Пакуль іх народ не адкіне;
У тым краю, дзе дурні пануюць,
Лад і дабро хутка гіне. —

Г. Лсучык

добу быу гэта прадстаунік народу і ён выбары не зацьвердзіу, а назначыу свайго аднадумца шляхціца Петра Гінтаута, які сваімі груба шовіністычнымі пастулкамі і шляхоцкімі капрызамі крыудзіць нацыяналчнае і чалавечае пачуцьцё сялян.

Г-н.

У Вязынскай гміне, Вялейскага павяту, выбары у гмінную раду адбыліся як і трэба—выбралі тых, каго хацела грамада. Але гэта відаць не спадабалася тутэйшаму абшарніку Гіцэвічу, які пастарауся пазнахадзіць прычыны(чаго у нас пан ня зможа!) і павыганяу радных, а панасажывау—сабе паслушных ня зважаючы на пратэсты выбаршчыкау. Адным словам: скачы уража, як пан кажа. І вось цянерашняя рада скачыць пад дудку Гіцэвіча. А пану гэта толькі і трэба было. Цяпер ён ніколі не даець сваіх падвод у гміну. Стайковую павіннасьць у нас адбываюць толькі самыя занепаушыя, бяднейшыя гаспадары, якія нават ня могуць адкупіцца ад гмінных верхаводау бутэлькай „Kreсówki". Пры выбарах у Павятовы Соймік, дык Гіцэвіч зраб у так, што выбрау сябе, бо ніхто яго выбіраць не хацеу. Дык вось як у нас сам упрауляе (самоупрауленьне) пан плюючы на закон і народ.

С. Саха.

Глумленьне асаднікау над беларусамі.

З мяст. Мір, Ярэміцкай гміны, Навагрудзкага павету ехалі пьяныя асаднікі і спаткаўшы па дарозе гаспадара з вёскі Некрашы, загадалі зьехаць яму з дарогі, а пасьля злесшы з воза зьбілі да паўсьмерці ні за што гэтага селяніна.

С.

У мяст. Турцы (Навагрудчына) на кірмашы селянін Гуз з вёскі Рапьева купіў сабе барана Гэтага ж барана перш таргаваў асаднік з двара Пузяневічы. Нагнаўшы селяніна ён пачаў адбіраць барана і біць селяніна Падышоўшы на выручку сын, быў таксама абабіты.

Ю. Б.

Паліцыянты буяняць.

Паліцыянты пастарунку ў Блошніках Арэхаўскай гміны, Дзісьнінскага павету абабілі Мацея Папелу за тое, што той ў дзень каталіцкага сьвята вазіў гной на свае поле.

Гэтыя самыя паліцыянты без дайпрычыны моцна зьбілі Стасючонка з в. Попелы панагавору яго ворага, які перад гэтым спаіў гарэлкай паліцыянтаў.

N. M.

Паліцыянт мястэчка Крынкі Віттэр (Горадзечына), калі ў царкве ішла служба ў Калядную ноч, круціўся паміж народу і вычвараў небывалыя рэчы. Падышоўшы да старага дзеда зрабіў рух, што хоча з ім прывітацца і калі той працягнуў руку, дык Віттэр плюнуў яму ў далонь. Шмат каго без усялякай прычыны вадзіў на пастарунак спісываў пратаколы, а былі выпадкі, што біў там жа па твары нават 60 годніх старыкоў.

Віхура Янка.

Паны пануюць.

Было гэта прошлым летам — селянін в. Аляхновічы Марка Войцік вывеў пасьвіць каня ды ня ўгледзіў як конь узышоў на дзірван мясцовага пана Ф. Гедруся. Калі Войцік пашоў зганяць каня, разлёгся выстрал і Войцік зваліўся вадстрэлены Ф. Гедрусем. Збегшыяся людзі нашлі Войціка ужо няжывым.

У Дзісьненскім павеце ёсьць двор пана Багуцкага Чырвоны Двор. Кухарка ноччу даіла кароў, а хлапчук сьвяціў ёй лучынай і відаць недзе закінуў агонь і двор згарэў. Чамусьце пану Багуцкаму ўздумалася намучыць суседнія вёскі,—па яго даносу, быццам сяляне яго спалілі, пачаліся вобыскі, арышты, пабоі ў вёсках Шаркаўшчына, Пятровічы і інш

Цімох.

Кінь наўкола вокам,
Дык крывавым сокам,
Ня сьлязой заплачыш,
Як усё пабачыш.

З гэтакай апекай, дык нас зьядуць сьвіні,
Ці мусім зрабіцца кусьлівай сабакай.

Ф. Богушэвіч.

СПАТКАНЬНЕ

Быў туманны дзянёк,
Сыпаў дробны сьняжок,
Я варочаўся з лесу да дому
Дроў я вёз лайны воз
І быў гэтак замёрз,
Як ня зьмерзнуць здаецца нікому.

Я дастаў з торбы ком,
Бо далёка быў дом,
І стаў есьці яго, каб сагрэцца.
Бачу: спераду конь,
Ад сярнічкі агонь—
Яздак проста ка мне так і прэцца.

Параўняўся са мной,
Крыкнуў моцна мне „стой"
І давай бізуном біць мне ногі,
Што я шапкі ня зняў,
Добры дзень ня сказаў,
Першы з возам ня з'ехаў з дарогі.

Каб я сала яму,
Альбо грошаў суму,
Так бы можа так-сяк адкупіўся.
Я нічога ня меў,
А ён, сколькі хацеў,
На да мною нешчасным глуміўся.

Потым зноў паляцеў,
Я за ім паглядзеў
І пазнаў,—быў жандар то пры гміня
Надта біў ён людзей
І старых і дзяцей
Нават баб бізуном сек па спіня.

Пастаяў я, пaждаў,
Ком з зямлі падабраў
Зноў кабылу пагнаў па дарозя.
Сьлёзы ўцёр на твары,
Ісці ня мог, хоць памры
Улез на дровы,—паехаў на возя.

Шмат дастаў я нуды,
Кляў жандарма тады,
Прасіў смерці на ўсю іх пароду.
Што наш край занялі
І за звычай ўзялі
Бізуном секчы цела народу.

Ні пра што. ні за што
Як захоча з іх хто,
Бье што сіл, пакуль што не заробіць.
А нічога ня даў,
Ці што проміў сказаў,
Агітатарам ён цябе зробіць.

Дык глумеце вы нас,
Перацерпім мы час
Вашых праў, вашай панскай злой волі
Нашы слёзы і страх
Няхай ў новых парах
К вашай панскай прылучыцца долі.

Нехай ўсе сінякі,
Што спісалі бакі
Плечы, ногі і твар бяларусам
Сядуць гузам адным
Там, гдзе месца тваім
Закруцястым і пешчаным вусам.

А. Юрасік.

З беларускага жыцьця.

У м. Глыбокім, Дзісьненскага павету 1-га лютага перад сабраўшымся народам выступалі з інформацыйнымі прамовамі паслы Кс. А. Станкевіч і П. Мятла. Гэтымі-же пасламі быу наладжаны *пасольскі сэкрэтарыят на Дзісьненскі павет. Сэкрэтарамі вызначаны: грам. Гайка (м. Глыбокае) і грам. Лубчонак (в. Несьцярэвічы).*

У зьвязку з распараджэньнем аб высылцы грамадзян ня маючых польскага падданства бадай усе слуцкія паўстанцы падлегалі высылцы за межы Польскага гаспадарства. У справе гэтай пасол Б. Тарашкевіч меў гутарку з дэлегатам Ураду ў Вільні Романам, пасьля якой п. Роман абецаў вышэйназванае распараджэньне ня ужываць да слуцкіх паўстанцаў аднак з тым варункам, каб кожны з іх давёў дакумантальна свае учасьце ў паўстаньні.

У нядзелю 28 студня адбыўся агульны сход Таварыства Беларускай Школы. Прысутных было больш 50 сяброў. Парадкам дня было: 1) Даклад прэзыдыума Цантральнай Беларускай Школьнай Рады, 2) Грашовая справаздача, 3) Справаздача нагляднай камісіі, 4) Давыбары сябраў у Школьную Раду і у наглядную камісію, 5) Зьмена статуту, 6) Аб утварэньні камісіі дзеля апрацоўкі школьных навучнікаў, 7) Аб аб'еднаньні ўсіх новапаўстаўшых таварыстваў беларускай школы, 8) Аб склікаиьні зьезду беларускіх вучыцялёў і 9) Бягучыя справы.

Пасьля разгляду усіх пытаньняў агульным сходам былі вынясены належачыя пастановы, з якіх важнейшыя: зрабіць заха ы аб ўваходзе новых таварыстваў беларускіх школ у Віленскае Цантральная Таварыства, каб такім чынам аб'еднаць між сабой усе школы і зрабіць працу вучыцельства больш пляноваў і карыснейшай, створыць пры Школьнай Радзе камісію для апрацоўкі школьных навучнікаў згодня з вымаганьнямі сучаснай педагогікі. склікаць сход беларускіх вучыцялёў сярэдняй школы на вялікодным тыдні, а летам—усяго беларускага вучыцельства. для апрацаваньня праграмы працы ў школах, даручыць зрабіць Школьнаў Радзе адпаведныя зьмены ў статуце і ўнясьці на разгляд чароднаму агульнаму сходу.

У празыдыум Школьнай Рады выбраны: Старшыня Б. Тарашкевіч. віцэстаршыня А. Луцкевіч, скарбнік Г. Багдановіч, намесьнік скарбніка кс. Адам Станкевіч, сэкратар П. Біндзюк, кандыдат Рак-Міхайлоўскі. Апрача азначаных асоб у склад Школьнае Рады увайшлі: сьв. Пліс, М. Красінскі. Падбярэзкі, А. Сакалова, А. Уласаў, М. Кахановіч. Кандыдаты: Малькевіч і Пяткевіч. У склад нагляднай камісіі выбраны: Ф. Ярэміч, П. Жаўрыд. Ф. Пяткевіч і Ф Кепель.

Даводзім да ведама Беларускаму Пасольск. Клюбу, што ум. Маладэчына месцовымі беларусамі быў закладзены аддзел Беларускага К-ту Помачы пацярпеўшым ад вайны, але Вялейскі староста не зацьвердзіў, тлумачучы тым, што гэта ёсьць бальшавіцкая арганізацыя.

Увага! З прычыны безупынных заяў падпісчыкаў «Нашай Будучыны» аб недаходзе газэты рэдакцыя разаслала усім падпісчыкам анкету гэткага зьместу. 1. імя і прозьвішча, 2. адрас, 3. з якога часу падпісчык, 4. колькі атрымаў намяроў за час падпіскі, 5-ці даходзяць іншыя газэты не беларускія і 6. калі ведама прычына чаму недаходзяць, дык падробна апісаць. Просьба як мага хутчэй запоўніць анкету і прыслаць у рэдакцыю, якая прымець адпаведныя крокі для урэгуляваньня дастаўкі газэт сваім падпісчыкам. Хто не атрымае анкеты, просім сьпісаць адгэтуль.

Беларускае Таварства Дапамогі Ахвярам Вайны просіць запісвацца ў сябры: гадовая складка 1000 мар. Таварыства мае пад сваей апекай два дзіцячых прытулкі; ў Вільні і ў Горадні па 100 дзяцей у кожным. Ня маючы пастаянных моцных грашовых крыніц і пры сучаснай ўсе ўзрастаючай дарагавізне К—ту вельмі трудна ўтрымліваць прытулкі і дзеля таго зьвяртаемся да грамадзянства з просьбай складаць ахвяры грашыма і натурай (збожжа, бульба, палатна). Ахвяры прымаюцца: Вільня, Віленская 12 кв. 6.

Беларусы у Латвіі.

КРЭСЛАУКА, 4 лютага. Крэслаускім Аддзелам Беларускага Таварыства „Бацькаушчына" ладжана была ужо трэцяя вечарына у гэтай зіме. Стаулялі „Міхалку" Далецкіх і „Збянтэжаны Саука" Л. Родзевіча. Удалую гульню артыстау горача вітала публіка, якая запоунiла усю залю.

КРАСЛАУКА, 27 студня. У памешканьні Беларускай школы вядомая дзеячка П. Мядзёлка-Грыб прачытала лекцыю на тэму: Роль нацыянальнасьці у стварэньні агульна людзкой культуры. Лекцыя вельми зацікавіла сабраушыхся крэслаўцаў, якія атрымалі яркое асьвятленьне пытаньяу, закранутых у лекцыі.

Лекцыю ладзіу Крэслаускі Аддзел Белар. Т-ва „Бацькаушчына".

Тутэйшы.

З Вільні.

Сьвяткаваньне угодкай незалежнасьці Літвы.

Віленскае Літоўскае грамадзянства робіць прыгатаўленьні да ўрачыстага абходу угодкай незалежнасьці, Літвы, якія прыпадаюць 16 лютага.

Канфіскацыя „*Garsasa*"

Літоўскі тыднёвік „*Garsas*" № 5 быў канфіскаваны за артыкул „Сікорскі і Кацыкі". Канфіскаваны таксама і № 6.

Курс на грошы.

(Віленская біржа.)

За 13 лютага.

Долары	43.000
10 залатых рублёў	243.800

Рэдактар-выдавец А. АМЕЛЬЯНОВІЧ.

Друкарня Дворжэца, Завальная 32